ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 156 (1425) | ЧАЦЬВЕР, 9 ліпеня 1931 г.

Заканчваем абгаварэньне тэзісаў

Сотні тарпянікаў сталі ўдзельнікамі зьезду

Нясем зьезду дзесяткі прапаноў дадаткаў у проэкт тэзісаў

Узварушыліся ў апошнія дні

Атрымаўшы тэзісы сэкцыі торпу партыйныя, профсаюзныя і комсамольскія організацыі торпазаводу Грэбянёва (Быхаўскага раёну) не разгарнулі масавай прапрацоўкі іх і падрыхтоўкі да зьезду.

Нават спэцыяльная пастанова прэзыдыуму Магілёўскага РКК РСІ па выніках рэйду праверкі падрыхтаванасьці да Усебеларускага зьезду рабселькораў, якая адзначыла поўную бязьдзейнасьць заводзкіх організацый,—не заставіла кіраўніцтва торпзаводу разгарнуць работу.

І толькі 5-га ліпеня адбыўся першы агульны сход рабочых па пытаньню ўдзелу ў прапрацоўцы тэзісаў, а 7-га па гэтаму пытаньню быў скліканы комсамольскі сход.

Сакратар ячэйкі адзначыў, што тэзісы ляжаць на шафе ў дырэктара заводу. Звыш 100 экз. ляжала ў габінэце, а працаўнікі заводу пажымалі плячыма: „ну, што-ж не даюць дадаткаў, мы на сходзе гутарылі"...

Зараз комсамольская ячэйка організавала брыгады на прапрацоўцы тэзісаў, да кожнай брыгады прымацаваны партыец.

Першы дзень працы брыгад у агульнажыцьцях даў канкрэтныя вынікі: атрыманы каштоўныя прапановы.

У галіне забесьпячэньня торпазаводаў рабочай сілай, тарпянікі прапануюць, каб кожны рабкор падрабязна прапрацаваў пастанову СНК СССР аб адходніцтве і падрабязна растлумачыў яе ня менш як з рабочым-сэзоньнікам.

Праца тарпяных коопэратываў і грамадзкага харчаваньня зьяўляецца адным з найбольш важных вучасткаў працы заводу.

Вывучэньне сыстэмы перабудовы коопэратыўнай працы на торпазаводах высоўвае перад усёй грамадзкасьцю і рабкорамі асабліва важную задачу штодзённым практычным удзелам, конкрэтнай дапамогай організаваць грамадзкае харчаваньне і забесьпячэньне рабочых такім чынам, каб зрабіць яго цэхам прадпрыемства, дапамагаючым у выкананьні прамфінпляну.

У галіне падрыхтоўкі кадраў рабочыя-тарпянікі прапануюць, каб кожны рабочы ў першую чаргу рабкоры мэханічнага цэху падрабязна знаёмілі-б з машынай і навучылі-б вытвараць мелкі рамонт рабочых і брыгадзіра арцелі, якія працуюць на машыне.

Неабходна форсаваць тэмпы падрыхтоўкі кадраў праз ФЗВ; маючыяся зараз два фабзавучы ў БССР ня могуць задаволіць узрастаючыя патрэбы торпапрамысловасьці.

Організаваць гурткі па аўладаньню тэхнікай, прыцягнуўшы да іх увесь тэхнічны пэрсонал заводу.

Вось прапановы рабочых торпзаводу „Грэбянева".

І. Шапіра.

Адпачываць у бурныя дні—немагчыма

Адчынены ліст прафкому факультэту народнае гаспадаркі БДУ

Улічваючы цяжкае становішча па выкананьню промфінпляну торпапрамысловасьці мы, пяць студэнтаў факультэту народнае гаспадаркі абвяшчаем сябе мобілізаванымі на час летніх вакацый на торпазаводы.

Мы абавязваемся сваім практычным удзелам у непасрэднай працы торпазаводу, організацыяй ударных брыгад, плянава-опэрацыйных груп і г. д. дапамагчы хутчэйшаму ператварэньню Беларусі ў торпяны Донбас.

Мы лічым немагчымым адпачываць у бурныя дні трэцяга рашаючага, таму выклікаем усё пролетарскае студэнцтва факультэту народнае гаспадаркі, іншыя факультэты БДУ і ўсе інстытуты БССР пасьледваць нашаму прыкладу, скарыстаўшы свой адпачынак для фізычнай працы на торпазаводзе.

Агульнымі сіламі, сумесна з усёй грамадзкасьцю пры значнай дапамозе друку і яго арміі рабселькораў, мы здолеем ліквідаваць прарывы ў тарпянай прамысловасьці і даць краіне паліва.

Карнажыцкі Янка, Паўлючэнка, Буднікаў, Бацьвінік, Карнажыцкі В.

Заўтра пачынаецца ўсебеларускі зьезд рабселькораў

Да вынікаў прапрацоўкі проекту тэзісаў сэкцыі торпу

Заўтра пачынаецца Усебеларускі зьезд рабселькораў. Побач з абгаварэньнем агульных задач друку ў трэцім рашаючым годзе, зьезд у спэцыяльных сэкцыях абгаворыць пытаньні, стаячыя перад рабселькорамі важнейшых галін прамысловасьці і народнай гаспадаркі БССР.

Месяц таму назад, „Чырвоная Зьмена" надрукавала проект тэзісаў сэкцыі торпу і энэргетыкі, якія пасьля масавай глыбокай прапрацоўкі на торпазаводах, а потым на зьезьдзе павінны будуць зьявіцца конкрэтным плянам у барацьбе рабселькораў за ператварэньне Беларусі ў тарпяны Донбас.

Сёньня, напярэдадні зьезду, патрэбна падвесьці некаторыя вынікі прапрацоўкі тэзісаў сэкцыі торпу.

Прапрацоўка тэзісаў па ўсіх заводах шчыльна ўвязвалася з мобілізацыяй мас на ліквідацыю прарываў у прамфінпляне, у выніку па некаторых заводах мы мелі падвышэньне торпаздабычы, організацыю шэрагу новых брыгад, насьценгазэт і г. д.

Прапрацоўваючы тэзісы, рабочыя тарпянікі ўносілі шэраг каштоўных прапаноў. Напрыклад, на торпазаводзе „Шлях Соцыялізму" шырока разгарнуўся рацыяналізатарскі рух, там інжынэр Марголін выпайшоў плуг для ўборкі торпу, комсамольская ячэйка сумесна з выязной рэдакцыяй „Чырвонай Зьмены" мобілізавала навокал гэтага вынаходзтва думку ўсяе грамадзкасьці. У зьвязку з прапрацоўкай тэзісаў на заводзе разгарнуўся месячнік па ліквідацыі прарыву, масавы паход за новы быт, за культурнае абслугоўваньне тарпянікаў.

Міхановіцкі торпазавод правёў вопыт дэкаднай, пабрыгаднай калькуляцыі, што дае магчымасьць кожную дэкаду мець точны улік усіх недахопаў, асабліва якасных паказчыкаў прамфінпляну, у той час, калі ў мінулым гэтыя калькуляцыі складаліся пасьля скончэньня сэзону, рабочыя прапануюць у якасьці дадатка да тэзісаў перанясеньне гэтага вопыту на ўсе заводы.

На гэтым-жа заводзе грамадзкасьць узяла на сябе абавязак організаваць як вопыт драўляную ўзкакалейку ад чыгункі да торпазаводу.

Рабочыя Асінторпу, у парадку прапрацоўкі тэзісаў, зьвярнулі асаблівую ўвагу грамадзкасьці БССР на налажваньне культурна-масавай працы сярод тарпянікоў. Яны выклікаюць саюз працаўнікоў узяць шэфства над торпапрамысловасьцю. „Організуйце культурны адпачынак тарпянікаў, дайце радыё ў кар'еры", вось іх патрабаваньне.

Асаблівую ўвагу ў час прапрацоўкі тэзісаў рабочыя тарпянікі зварочвалі на падрыхтоўку кадраў, таму ў прапановах шэрагу заводаў („Шлях Соцыялізму", Асінторп, Грабляёва і інш.) маюцца настойлівыя запатрабаваньні аб організацыі сеці ФЗВ на заводах і тарпяных гурткоў. Ня меншая ўвага ўдзяляецца ў дадатках пытаньню аўладзеньня тэхнікай.

Побач з пабудовай новых магутных электростанцый, побач з распрацоўкай генэральнага пляну электрыфікацыі, патрэбна рацыянальна поўнасьцю скарыстоўваць электраэнэргію, якая маецца ў нас. Белдрэс сумесна з рэдакцыяй „Ленінскі Шлях" зьвярнуўся з заклікам да рабкораў Віцебскага, Магілёўскага і Аршанскага раёнаў з запатрабаваньнем напружыць усе сілы, каб скарыстаць 10 тысяч кілёват электраэнэргіі, якія здольна даць Белдрэс. Адказу белдрэсаўцы чакаюць на зьезьдзе.

Шэраг дадаткаў і прапаноў, якія вынесены грамадзкасьцю ў час прапрацоўкі тэзісаў павінны будуць быць уважліва прадуманы і прапрацаваны дэлегатамі зьезду, удзельнікамі працы сэкцыі торпу з такім разьлікам, каб зьезд узброіў бальшавіцкага друку наметкі-бы шлях сваёй барацьбы за ператварэньне Беларусі ў торпяны Донбас, гіганцкімі бальшавіцкімі тэмпамі.

Крывую здабычы—у гару!

5 ліпеня дало значнае зьніжэньне торпаздабычы. Усяго здабыта за гэты дзень 2360,6 тон торпу, што складае 28,8 проц. сутачнага заданьня. Такім чынам, сэзонны плян выкананы на 18,8 проц., альбо 132.150 тон, што складае 34,9 проц. каляндарнага пляну.

Усебеларускі зьезд рабселькораў

адкрываецца ў гор. Менску 10-га ліпеня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні дому Комасьветы імя Карла Маркса

АБВЕСТКА ДНЯ

1) Вынікі пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б і задачы друку—дакладчык сакратар ЦК КП(б)Б т. Гей.

2) Задачы рабселькораўскага руху, партыйнага кіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку—дакладчыкі т. т. Будзінскі і Курцік.

3) Работа сэкцый зьезду.

Мандаты абраным на зьезд дэлегатам будуць выдавацца 9-га і 10-га ліпеня ў памяшканьні дому Комасьветы імя Карла Маркса. Для атрыманьня мандату абавязкова патрэбна прад'яўленьне паведамленьня ад організацыйнай камісіі аб выкліку на зьезд.

Разьмеркаваньне запрашальных білетаў на зьезд для рабочых менскіх прадпрыемстваў будзе праводзіцца праз культпроп Менскага гаркому КП(б)Б, куды трэба зьвяртацца з заяўкамі.

Організацыйная камісія.

Да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ

59 дзён засталося на XVII МЮД'у

Зробім іх днямі штурму за шматмільённы комсамол

Да МЮД'у 100 пр. рабочай моладзі заводу—у комсамол

Зьлёт рабочае моладзі заводу імя Ланцуцкага (Гомель), абмеркаваўшы заклік тав. Косарава аб пашырэньні шэрагаў УсеЛКСМ да 17-га МЮД'у на 1.500.000 чалавек, што значыць, дабіцца да МЮД'у выкананьня рашэньня 9-га зьезду аб 100 проц. ахопу рабочае моладзі у КСМ, упэўнівае ЦК ЛКСМБ у тым, што мы гэта выканаем. Змагаючыся за шматмільёны комсамол, мы даб'емся выкананьня і перавыкананьня плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Да гэтага часу ў нас рабочая моладзь ахоплена комсамолам усяго на 60 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што мы яшчэ не змагаемся, як належыць за выкананьне пастановы зьезду аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю.

Астаўшыяся 64 дні да 17-га МЮД'у зробім днямі штурму ў нашай працы.

За шматмільёны комсамол!

Сэкратар колектыву заводу імя Ланцуцкага Маляр.

Тэмпы ўзяты

ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу „Чырвонай Зьмене"

За час падрыхтоўкі да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ комсамольская організацыя Гомелю дасягнула значных посьпехаў

За першы дзесяцідзёньнік чэрвеня месяца прынята ў КСМ 154 ч., за другую дзесяцідзёнку 179 чал. і за трэцьюю 352, усяго за чэрвень месяц прынята 655 чалавек

ФЗВ „Рухавік рэволюцыі" у асноўным акомсамолены. Комсамолам ахоплена 90 проц. фабзайцаў. ФЗВ чыгуначнікаў разгарнуў працу па падрыхтоўцы да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ, у зьвязку з чым на апошніх двух сходах прынята ў комсамол 202 чал. Агульны ахоп моладзі комсамолам па ФЗВ чыгуначнікаў складае 75 проц. ФЗВ торпзаводу „Шлях да соцыялізму" поўнасьцю акомсамолены. З 68 фабзайцаў—у комсамоле 66 чалавек. ФЗВ Добрускай папяровая фабрыкі акомсамолен на 75 пр.

Гарадзкі камітэт запэўнівае ЦК і „Чырвоную Зьмену", што да кантрольнага пленуму фабзавучы будуць цалкам акомсамолены.

Па прадпрыемствах праведзен шэраг мітынгаў рабочае моладзі па закліку тав. Косарава—вырасьці да МЮД'у на 1 500.000, дзякуючы чаму падана заяў у комсамол 455 чалавек. ГК ЛКСМБ Гузоўскі.

Да кантрольнага пленуму прыдзем з паўтаратысячнай арміяй

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене"

Мсьціслаўскі райком комсамолу, пад непасрэдным штодзённым кіраўніцтвам з боку райкому КП(б)Б, разгарнуў вялікую работу па падрыхтоўцы да кантрольнага пленуму ЦК.

Організацыя разгарнула работу па ажыцьцяўленьні рашэньняў апошніх зьездаў КСМ аб ператварэньні КСМ у шматмільённую організацыю.

21-га чэрвеня па 1-е ліпеня 1931 г. організаваны 10 комсамольскіх ячэек пры колгасах, з ахопам колгаснай моладзі ў ліку 185 чалавек. Уся організацыя з 337 комсамольцаў вырасла за два месяцы да 1115 комсамольцаў.

Бюро райкому ЛКСМБ і ўся Мсьціслаўская раённая організацыя завяраюць Цэнтральны Камітэт і яго баявы орган „Чырвоную Зьмену", што надалей будзем змагацца за шматмільённы комсамол. Да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМ прыдзем з 1500-най комсамольскай арміяй.

Сэкратар Мсьціслаўскага РК ЛКСМБ Казлоў.

АРЫТМЭТЫКУ ПРАЦЫ—НА КОЛГАСНЫЯ ПАЛІ

Дакладны ўлік зьдзельшчыны, па колькасьці і якасьці працы кожнага колгасьніка, і ліквідацыя абязьлічкі — стымулы ўдарнага правядзеньня ўборачнай

Уборка сенажаці у поўным разгары. Праз адну-дзьве дэкады рад колгасаў прыступяць да ўборкі азімых пасеваў. Правільная організацыя працы, дакладная расстаноўка людзкой і цягавай сілы, поўная нагрузка ўборачных машын, ліквідацыя абязьлічкі—гарантыя для пасьпяховага выкананьня пляну ўборачнай кампаніі. Саўгасы і колгасы, якія сваячасова падрыхтаваліся да сенаўборачнай кампаніі, правільна організавалі працу і з посьпехам выконваюць пляны сенаўборкі.

Усё-ж, па раду раёнаў, організацыі працы і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі не надаюць належнай увагі. Рэйд юнкораўскіх брыгад па Крупскаму раёну выявіў, што падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі ідзе самацёкам, раённыя організацыі не разгарнулі масавай працы. Праверка становішча работы па пераводу колгасаў на зьдзельшчыну ў Лельчыцкім раёне, паказаае, што колгасы формальна лічацца пераведзенымі на зьдзельшчыну, а па сутнасьці—падзёншчына.

Комсамол абвясьціў паход за організацыю працы і правільны ўлік працадзён у колгасах. Выступіў у бой з усялякімі скажэньнямі бальшавіцкага прынцыпу зьдзельшчыны. Сёньня 13-ты дзень паходу. Мобілізавана 5001 чалавек. Улік працадзён праводзіцца ў 3033 колгасах. Працоўная кніжка даведзена да 73259 чалавек, але гэта яшчэ далёка нездавальняюча.

Неадкладная задача комсамольскіх організацый узяць тэмпы работы, нанесьці руйнуючы ўдар па скажэньнях бальшавіцкага прынцыпу зьдзельшчыны. Забясьпечыць ударнае правядзеньне ўборкі.

Ня спыняць паходу пакуль працоўная кніжка ня будзе даведзена да кожнага колгасьніка.

Рэкорд галавацяпства

Лельчыцы. Перавод колгасаў на зьдзельшчыну па Лельчыцкаму раёну праведзены формальна.

Праведзеным рэйдам па праверцы становішча ўліку працадзён у колгасах выяўлены такія абураючыя факты: райсаюз, замест перадачы працоўных кніжак у колгасы, накіраваў іх па спажывецкіх крамах, а апошнія выдаюць колгасьнікам працоўную кніжку толькі пры атрыманьні ў краме прамтавараў. Раённыя організацыі ведалі пра гэта, усё-ж гэтаму абураючаму галавацяпству райколгассаюзу ня дадзена рашучага адпору.

Пры правядзеньні комсамольскага паходу ў асобных колгасах комсамольцаў-брыгадзіраў сустрэлі з разважаньнямі аб тым, што зараз непатрэбна праводзіць улік. Старшыня Замоскага колгасу Хвацін—брыгадзірам-комсамольцам адказаў, што „мы ня праводзім уліку таму, што ўсёроўна ў канцы года будзем падводзіць вынікі работы і тады ўлічым працу кожнага колгасьніка“

Куцанаў

Рэйд ударнай юнкораўскай брыгады

Адвесьці ўдар ад уборачнай

Ударная юнкораўская брыгада газэты „Чырвоная зьмена“ і „Юнгэр Арбэйтэр“ правяла рэйд па праверцы падрыхтаванасьці ўстаноў (Райза, Колгассаюз, Коопсаюз, Райсаюз) Крупскага раёну да ўборачнай кампаніі.

Рэйд паказаў, што масавая работа вакол уборачнай кампаніі разгорнута зусім дрэнна. На сходах прафсаюзаў і іншых грамадзкіх організацый пытаньне аб уборачнай кампаніі не абгаворана. Ніякай працы не праводзіцца па організацыі жаночай працы да ўборачнай кампаніі.

На зьдзельшчыну пераведзены, (як лічыцца ў райколгассаюзе) усе колгасы, але яна ажыцьцяўляецца фармальна, няма дакладнага ўліку працы колгасьніка па колькасьці і якасьці работы, няма ўліку працадзён. Не ліквідавана абязьлічка. Пяцідзеньнік уліку працы ў колгасах не праведзены як масавая політычная кампанія. Комсамольская організацыя не організавала пабаявому паход за ўлік. 18 колгасаў засталіся без працоўных кніжак.

Зусім дрэнна па колгасах разгорнута работа па соцспаборніцтву і ўдарніцтву.

Рамонт уборачных машын праходзіць марудна. Організаваныя 5 майстэрняў працуюць з перарывамі з-за адсутнічаньня жалеза і вугалю.

Не хапае ўборачных машын, асабліва касілак, жнеяк, ільнацерабілак і бульбакапалак. Для раду прысланых машын не хапае частак сядзеньняў, шасьцерань і інш. Няма таксама запасных частак для завезеных машын.

Ня гледзячы на тое, што па пляну 1931 г. Крупскі раён павінен атрымаць запасных частак на 2200 руб., з якіх на 880 р. павінна быць завезена ў другім квартале. Гэты плян зусім не выкананы. На шэраг напамінкаў і тэлеграм раённых організацый Белкоопснаб нічога конкрэтнага ня зрабіў. Адначасова з гэтым, прыналёце выяўлена, што райкоопсаюз трымае на складзе 20 палольнікаў і 60 акучнікаў, у якіх колгасы адчуваюць патрэбу.

Для ліквідацыі прарываў у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі і разгортваньні работы па організацыі працы ў колгасах, раённыя організацыі мобілізавалі 45 чал. Праведзена нарада партыйнасавецкага, комсамольскага і профсаюзнага актыву. Мобілізаваныя накіраваны ў сельсаветы для дапамогі апошнім правесьці падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Брыгада.

Прамова т. Сталіна—выходны пункт у пераключэньні на новыя тэмпы, новы размах, за лепшую якасьць

Аб прапрацоўцы прамовы тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў

ПАСТАНОВА СЭКРАТАРЫЯТУ МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ АД 5-га ЛІПЕНЯ г. г.

Новая абстаноўка—новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва—такавы лёзунг партыі, сформуляваны яе правадыром тав. Сталіным на нарадзе гаспадарнікаў,

Лічучы, што выступленьне тав. Сталіна мае вялізарнейшае значэньне, зьяўляючыся грандыёзнай бальшавіцкай програмай партыі і пролетарыяту ў справе пасьпяховага выкананьня 5-годкі ў 4 гады, Сэкратарыят Менгаркому КСМ пастанаўляе:

1. Абавязаць колектывы і ячэйкі КСМ неадкладна забясьпечыць поўную мобілізацыю комсамольскай організацыі на распрацоўку пастаноў пленуму ЦК УсеЛКСМ і гістарычнага выступленьня правадыра партыі і пролетарыяту тав. Сталіна. На працягу адной дэкады організаваць ва ўсіх колектывах і ячэйках гурткі, конфэрэнцыі, зьлёты і г. д. для шырокай популярызацыі і прапрацоўкі гэтых матэр'ялаў. Культпропу Гаркому забясьпечыць кіраўніцтва і аказаць поўную дапамогу організацыі ў гэтай працы.

2. Бюро Гаркому лічыць, што пастановы пленуму ЦК УсеЛКСМ і выступленьне тав Сталіна павінны зьявіцца выхадным пунктам усіх конкрэтных практычных спраў колектываў, ячэек, груп, кожнага комсамольца і асабліва саюзнага кіраўніцтва, забясьпечыўшы поўнае выкананьне задач, пераключэньня „на новыя тэмпы, новы размах, новую якасьць далёка перавышаючую тое, чаго мы дасягнулі“, забясьпечыўшы ў суадпаведнасьці з гэтым неадкладную карэнную перабудову працы КСМ організацыі на прадпрыемствах, у саўгасе, колгасе з тым, каб поўнасьцю выканаць ранейшыя пастановы гаркому ЛКСМБ аб перабудове саюзнай працы.

Пад сьцягам ленінскай партыі, яе правадыра тав. Сталіна, пад сьцягам бальшавіцкіх рашэньняў пленуму ЦК УсеЛКСМ, Менская комсамолія, у бой за 1.500.000 новых комсамольцаў к 17 МЮД'у. За тэмпы і якасьць, за выкананьне бальшавіцкіх плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ Янковіч

Да ўсебеларускай нарады пропогандыстых

ЗА АУЛАДАНЬНЕ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ТЭОРЫЯЙ

(У парадку абгаварэньня)

Ауладаньне марксысцка-ленінскай тэорыяй, комсамолам у сучасны пэрыод, у пэрыод абвостранай клясавай барацьбы, у тым ліку і за моладзь, мае асаблівае значэньне. Гэта як адзначыў IX-ты зьезд УсеЛКСМ, „зьяўляецца адной з рашаючых умоў у замацаваньні дасягнутага, у асноўным, навароту тварам да гаспадарчага будаўніцтва і ўздыму работы саюзу на больш высокую ступень“.

Політвучоба комсамолу Беларусі мае значныя дасягненьні, але побач з гэтым трэба адзначыць, што якасьць тэорэтычнай вучобы комсамольцаў даволі нізкая.

Амаль што, зусім адсутнічала ў комсамольскіх політшколах вывучэньне той ці іншай тэмы па матэр'ялах з першаісточнікаў.

Масавы паход за тэорыю

Таму асабліва важнае значэньне мае ініцыятыва Маскоўскай комсамольскай організацыі, якая высунула і праводзіць масавы паход за тэорыю па першаісточніках Маркса, Леніна, Сталіна.

Паставіўшы перад сабой задачу ўцягненьня ў паход асноўных мас комсамольцаў і рабочых, цеснай сувязі паміж вывучэньнем імі рэволюцыйнай тэорыі і іх практычнай работы ў барацьбе за прамфінплян, маскоўская комсамолія высунула лёзунг „кожны цэх—Ленінскі Універсытэт“

У нас на Беларусі вопыту правядзеньня паходу, на вялікі жаль пакуль няма. Праўда, менская комсамолія адразу падхапіла ініцыятыву Масквы, але не распрацавала дастаткова чоткіх практычных плянаў гэтага паходу, не правяла належнай растлумачальнай і організацыйнай работы сярод комсамольцаў і рабочых і таму добрыя пачынаньні менскай комсамоліі былі асуджаны на няўдачу.

Таму зараз, пры правядзеньні паходу, у нас на Беларусі прыходзіцца выключна грунтоўвацца на вопыце Маскоўскай організацыі, прыстасоўваючы яго да нашых умоў.

Як прыступіць да організацыі паходу

Пры прыступленьні да організацыі паходу, неабходна чоткае ўясьненьне кожным комсамольцам, кожнай ячэйкай і РК не толькі задач гэтага паходу, але організацыйных і практычных яго правядзеньня.

Пры правядзеньні паходу нельга забываць галоўнага,—стварэньня ў кожным цэху ленінскага універсытэту. Гэта значыць, што вучоба пераносіцца непасрэдна ў цэх. З удзельнікаў паходу ў кожным цэху ствараюцца групы па вытворчаму прынцыпу і політычнаму ўзроўню комсамольцаў і рабочых. Гэтыя групы пад кіраўніцтвам больш адукаваных комсамольцаў прапагандуюць матэр'ял па заданай тэме.

Прапрацоўка матэр'ялу па першаісточніках Маркса, Леніна і Сталіна павінна быць цесна ўвязана з задачамі, сталымі перад комсамольскай організацыяй, і таксама з ауладаньнем кожным комсамольцам навукай і тэхнікай. Вывучэньне ленінізму не павінна стаць догматычным. Кожны комсамолец павінен умець злучаць на аснове вывучэньня марксысцка-ленінскай тэорыі ауладаньне буйнейшымі проблемамі соцыялістычнага будаўніцтва з правільненьнем на ўсе драбнейшыя дэталі тэхнікі і эканомікі, глыбокага вывучэньня соцыялістычнай справы і разгортваньня бальшавіцкіх тэмпаў работы. (З рашэньняў другога пленуму ЦК УсеЛКСМ)

Прапрацоўка матэр'ялу ў групах павінна прайсьці пад доглядам і консультацыяй пропагандыстых. Кожныя 10 дзён праводзіцца конфэрэнцыя цэху Ленінскага Універсытэту, якая падагульвае прапрацаваны групай матэр'ял.

Організацыйна-падрыхтоўчая праца і методычнае кіраўніцтва паходам павінна быць праведзена опэрацыйна-методычнай групай ЦК ЛКСМБ. Пры РК і ГК неабходна для кіраўніцтва паходам стварыць опэрацыйна-методычныя тройкі. Пры кожнай ячэйцы вылучаецца адзін член бюро, які ведае разгортваньнем тэорэтычнага паходу ячэйкі. Асобныя кіраўнікі цэхаў ленінскага універсытэту, разам з кіраўнікамі ячэек складаюць аддзел па тэорыі, пры культмасавым сэктары колектыву. У задачы гэтых троек і аддзелаў уваходзіць распрацоўка пытаньняў методычнага кіраўніцтва, абгаварэньне програм і заданьняў прыстасоўваючы іх да ўмоў раёну, прадпрыемства, цэху, забясьпечаньне бесьперабойнай работы—цэхоў ленінскіх універсытэтаў.

Падрыхтоўка кадраў пропагандыстых з рабочых

Яшчэ адно пытаньне пры організацыі паходу павінна заняць вялікае месца—гэта забясьпечаньне кожнага цэха ленінскага універсытэту адпаведнымі пропагандысцкімі кадрамі. Кожны колектыў, кожная ячэйка адразу павінны заняцца пытаньнем, адкуль узяць гэтыя кадры.

Зразумела, для правядзеньня паходу патрэбна прыцягнуць пропагандыстаў-профэсыяналаў, навуковых работнікаў, раённага комсамольскага партактыву, студэнтаў. Але ясна, што мы ня зможам забясьпечыць кожную групу і нават кожны цэх пропагандыстымі, прысланымі аднекуль і па-другое, прысланы пропагандысты вельмі часта не знаёмы з умовамі работы прадпрыемства, цэху, брыгады, ня гледзячы на тое, што ён добра політычна падрыхтаваны, ня здолее увязаць правільна праходзімыя тэмы з тымі задачамі, якія стаяць перад комсамольцамі і рабочымі гэтага цэху, брыгады.

Гэта ўсё прымушае нас зараз гаварыць аб тым, каб пропагандысцкі склад кожнага цэху ленінскага універсытэту быў высунуты з комсамольцаў і партыйнага актыву таго-ж прадпрыемства, цэху. Для падрыхтоўкі іх неабходна пры кожным ГК, РК і нават колектыве ЛКСМБ організаваць кароткатэрміновыя курсы сталых сэмінараў, консультацый і г. д.

Опэрацыйнасьць ў кіраўніцтве

Пасьпяховасьць праводзімага паходу будзе ў значнай меры залежаць і ад таго, як здолее РК і ГК опэратыўна паставіць кіраўніцтва паходам. Як зможа сваечасова рэагаваць на недахопы распаўсюджаньня лепшы вопыт правядзеньня паходу на ўсю організацыю. З гэтай мэтай РК і ГК павінны вылучыць лепшыя колектывы ячэек, зрабіўшы іх апорнымі ў правядзеньні паходу, скліваць частыя зьлёты кіраўнікоў ячэек, інструктараў і г. д.

К.

Сапраўды магутна краіна Саветаў, сапраўды магутна партыя бальшавікоў, калі яна здолела стварыць гэткую зьмену

(З дакладу тав. Косарава на 2 пленуме ЦК УсеЛКСМ)

Перабудаваць свае шэрагі перабудаваць мэтады ўзьдзейнічаньня на масы

Таварышы, бюро ЦК даручыла мне далажыць пленуму аб тым, як працаваў і што зрабіў саюз за пройдзены намі з моманту IX зьезду пэрыод. Гэты пэрыод вельмі багаты і цікавы з пункту погляду тых працэсаў, якія адгледаліся ў саюзе і ў асяродзьдзі рабоча-сялянскай моладзі. Яны, гэтыя працэсы, абумоўлены асаблівасьцямі перажываемымі ўсёй нашай краінай.

Краіна Саветаў, разгарнуўшы пад кіраўніцтвам партыі наступаньне па ўсяму фронту у самы бліжэйшы час, у 1932 годзе (на год, а на рад важнейшых галін яшчэ раней) заканчвае пяцігодку.

Мы ўжо ставім больш грандыёзную задачу—падрыхтоўкі другой пяцігодкі, дзе будзе пакладзена праграма практычнага дзеяньня, аб якой гаварыў тав. Сталін на конфэрэнцыі гаспадарнікаў і якая формулюецца 5-м словамі: дагнаць капіталістычныя краіны ў дзесяць год.

Другая пяцігодка, якая зараз распрацоўваецца, будзе зьяўляцца выразам усё нарастаючага бальшавіцкага наступленьня. Задача ўсіх грамадзка-палітычных організацый краіны, бязумоўна, у першую галаву ленінскага комсамолу—як самага лепшага, вернага, галоўнага дапаможніка партыі, заключаецца ў тым, каб перабудаваць свае рады, перабудаваць мэтады свайго ўзьдзейнічаньня на масы. Гэта—цэнтральнае месца работы ленінскага комсамолу і яе выходны пункт.

Гэта тое прынцыповае новае ў жыцьці краіны і, значыцца, ленінскага комсамолу, што павінен усьвядоміць кожны дэлегат пленуму, кожны актыўны работнік, кожны член саюзу.

У чым сэнс гэтай перабудовы? Гэта перабудова павінна нам забясьпечыць такія тэмпы, такія сілы, каб мы практычна вырашалі задачу—дагнаць капіталістычныя краіны ў дзесяць год.

Пытаньне ставіцца вельмі ясна і вельмі коратка: перабудаваць з такім разьлікам, каб у рабоце ўсіх організацый былі ўзяты такія тэмпы, якія-б гарантавалі выкананьне гэтай грандыёзнейшай гістарычнай задачы.

Сэнс перабудовы заключаецца ў тым, каб на ўсе віды грамадзка-палітычнай, культурнай, эканомічнай і дзяржаўнай дзейнасьці ўцягнуць новыя дзесяткі мільёнаў працоўных. Бяз гэтага ўцягненьня новых дзесяткаў мільёнаў працоўных ў актыўную працу ў соцыялістычнае будаўніцтва работу мы бальшавіцкімі тэмпамі ўзяць не зможам, бяз гэтага нам перабудавацца не ўдасца, бяз гэтага мы задачы дагнаць капіталістычныя краіны ў дзесяць год не вырашым.

Пытаньне аб уцягненьні новых дзесяткаў мільёнаў працоўных ў соцыялістычнае будаўніцтва ёсьць не толькі практычная задача. Не толькі пытаньне зьяўляецца рашаючым, палітычным, ад якога залежыць далейшы лёс пролетарскай рэвалюцыі. Вось чаму IX зьезд УсеЛКСМ пастанавіў стаць шматмільённым комсамолам і заклікаў усю організацыю да ўпартай барацьбы за ператварэньне ў жыцьцё гэтага лёзунгу.

Не зразумець гэтага, не адчуваць усёй велізарнай неабходнасьці ўцягненьня новых дзесяткаў мільёнаў працоўных у соцыялістычнае будаўніцтва—значыць не ведаць пэрспэктыў разьвіцьця. А працаваць без пэрспэктыў могуць толькі вузкія практыкі, якімі бюро ЦК за гэты час не было.

2. Ленінскаму комсамолу—ленінскі стыль работы

Работу саюзу за прайшоўшы пэрыод часу вызначылі рашэньні IX зьезду, а таксама спачынутая выбітная прамова тав. Сталіна. Адсюль вынікала ўся яго практыка і палітыка за апошнія 5 месяцаў, і без усякага сумненьня, адсюль будзе вынікаць і ўсё пэрспэктыўнае разьвіцьцё. Тэмпы, дзейнасьць, масавасьць, якасьць работы ленінскага комсамолу, барацьба за генэральную лінію партыі, за яе практычнае выкананьне, супроць опортуністых розных масьцей—вось над чым мы біліся і чым жылі гэтыя месяцы.

Барацьба з дробнабуржуазнай расхлябанасьцю, неорганізаванасьцю і бюракратызмам, за ленінскі стыль і опэрацыйнасьць у рабоце,—вось найбольш характарная асаблівасьць усёй дзейнасьці бюро ЦК за гэты час.

У барацьбе з пералічанымі недахопамі мы сустрэлі моцнае супраціўленьне і з боку пасобных актыўных работнікаў саюзу.

Бязумоўна, гэта супраціўленьне не выяўлялася высоўваньнем плятформ і утварэньнем фракцый. Не, таварышы, калі-б гэта было так, гэта было-б проста, гэта ня было-б страшна, усім было-б відаць, у чым справа.

Але уся бяда у тым, што дробнабуржуазныя рыскі, аб якіх мы кажам, настолькі глыбока захаваліся, што зачастую неабходны некалькі пар вялічальных акуляраў на вочы надзець, і ўсё-ж іх не заўважыць. Паспрабуйце выкрыць такі экзэмляр, які дае табе прысяжнае абяцаньне і слова комуніста зрабіць якую-небудзь справу, а фактычна палец аб палец ня ўдарыў, працуе, як вярблюд, як чарапаха.

Ня гледзячы на поўнае аднадушша па усіх палітычных і організацыйных пытаньнях, нажаль, у практыцы работы мы маем надзвычайна шмат такіх рысак, якія ніяк не адпавядаюць задачы падвышэньня бальшавіцкіх тэмпаў і знаходзяцца ў рэзкай супярэчнасьці з духам нашага часу.

Вось гэта барацьба за ўтварэньне ленінскага стылю ў рабоце ленінскага комсамолу—я ніколькі не перавялічваю—сапраўды была гэроічнай барацьбой. Справа ішла ня толькі аб праверцы выкананьня—справа ішла аб усім характары кіраўніцтва, аб перабудове яго, прычым аб такой перабудове, якую прыходзіцца рабіць на-хаду.

А для таго, каб забясьпечыць такую перабудову, трэба было перш за усе напасьці на так званае „агульнае кіраўніцтва, павесьці супроць яго рашучае наступленьне, адкрыць агонь па такіх рэзолюцыях, у якіх маецца „погляд ў нішто", але няма конкрэтнага, опэрацыйнага і дзейнага падыходу да пытаньня.

3. Ударніцтва і спаборніцтва становяцца сыстэмай у рабоце комсамолу

Пяройдзем да пытаньня аб становішчы саюзу. За час ад IX зьезду роля і значэньне ленінскага комсамолу на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва яшчэ больш павялічыліся, прыклады гэроічнай барацьбы комсамольцаў за пяцігодку памножыліся.

Зьявіўшыся ініцыятарамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, мы і па гэты дзень застаемся яго перадавымі праваднікамі. Няправільна зацьвярджаць, што ўвага саюзу да гаспадарчых пытаньняў быццам паслабляецца і што справа з ударніцтвам комсамольцаў, з іх удзелам у спаборніцтве знаходзіцца быццам бы ў стадыі таптаньня на месцы. Гэта ня верна. Наадварот. Сёньня ленінскі комсамол ужо працуе ня толькі над пытаньнямі ўзьняцьця вытворчасьці працы, ня толькі над выкананьнем промфінпляну асобных прадпрыемстваў, але і над дзяржаўным народна гаспадарчым плянам над пытаньнямі цэхавага плянаваньня, вынаходзтва, рацыяналізацыі, гасп. разрахунку і тэхнікі.

Зьезд паставіў перад саюзам рад новых, якасна больш высокіх задач, саюз пасьпяхова гэтыя задачы пачынае вырашаць.

Мы не забываем пра ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны, але ўжо цапляемся зубамі за плянаваньне, за гаспадарчы разрахунак, за тэхніку, за рацыяналізацыю, за вучот працы, калі справа ідзе аб колгасе, за правільную пастаноўку рахункаводзтва ў ім (ня жарты-ж—мы паслалі 20.000 рахункаводаў у колгасы), за ўсе важнейшыя проблемы, высоўваемыя пяцігодкай.

Іменна ў сілу ўсяго гэтага ленінскі комсамол пачынае прыцягваць усё большую ўвагу ўсіх палітычных і гаспадарчых організацый.

Менавіта ў сілу гэтага расьце да нас любоў партыі, вернымі памочнікамі якой мы зьяўляемся.

Менавіта таму ненавідзіць нас гультай, разгільдзяй, рвач, галавацяп, шкоднік.

Дазвольце спыніць вашу ўвагу і на некаторых пытаньнях якасьці гаспадарчай работы ленінскага комсамолу. У нетрах комсамолу вырасьлі плянава-опэрацыйныя групы. Работа гэтых груп працякае па двух напрамках. Першы напрамак: чоткая пляніроўка зьнізу—у цэху, у брыгадзе і ў групе. І па-другое—удзел у складаньні народна-гаспадарчага пляну. Але калі вопыт работы плянава-опэрацыйнай групы ў першай яе частцы ўжо пачынае распаўсюджвацца па ўсёй комсамольскай пэрыфэрыі, дык з другой часткаю, г. зн. з удзелам у распрацоўцы народна-гаспадарчага пляну справа абстаіць яшчэ слаба. Вінаваты ў гэтым камітэты, вінавата бюро ЦК, вінават ЦК цалкам.

Другі момант, характарызуючы барацьбу ленінскага комсамолу за авалоданьне новымі, якасна больш высокімі задачамі, гэта—ініцыятыва комсамольцаў заводу імя Леніна і комсамольцаў Севкабеля (Ленінград) у справе ўтварэньня гасп. разрахункавых брыгад.

Адгэтуль важнейшым зьвяном гасп. разрахунку становіцца ўжо ня толькі завод цалкам і ня толькі цэх, а гасп. разрахункавая брыгада, агрэгат, варштат. Гэта, таварышы, тое прынцыповае новае, колёсальна важнае ў нашай барацьбе за соцыялізм, у нашым удзеле ў гаспадарчай рабоце, з чым мы сустракаемся сёньня.

Гэтыя два мерапрыемствы—плянава-опэрацыйную групу і гасп. разрахункавыя брыгады—неабходна песьціць, расьціць, ахоўваць ад бюрократычных скажэньняў, бо яны адчыняюць новую паласу ў соцыялістычным спаборніцтве. Яны,—гасразрахункавая брыгада і плянава-опэрацыйная група—зьяўляюцца зараз выразам больш высокага этапу ў разьвіцьці соцыялістычнага спаборніцтва.

Ад увагі комсамолу да іх, залежыць далейшае пасьпяховае выкананьне рашэньняў IX зьезду аб тым што ленінскі комсамол у пэрыод соцыялізму павінен працаваць над якасна іншымі новымі, больш адказнымі задачамі.

Мы за гэты час прарабілі вялікую работу і ў галіне аўладаньня тэхнікай. Масы прыведзены ў рух, але камітэты адстаюць ад гэтага руху. Таварышы, кіраўнікі мясцовых організацый, прызнайцеся—над гэтым вы мала працавалі.

4. Мы абавязаны ведаць лепшых людзей нашай сучаснасьці

Якія-ж задачы выцякаюць з усяго сказанага? Першая задача—яе можна сформуляваць такім чынам: пакончыць з абязьлічкай ва ўдарным руху.

Абязьлічка ва ўдарніцтве даходзіць да нябачных памераў. Я сам быў сьведкаю таго, як на трактарным заводзе прэміявалі 150 лепшых ударнікаў. Праз некалькі дзён аказалася, што сярод іх былі лжэударнікі.

Чаму гэта адбываецца? Таму, што камітэты ня ведаюць лепшых ударнікаў.

А ведаць сваіх гэрояў-комсамольцаў неабходна. Яны лепшыя людзі сучаснасьці. Трэба цікавіцца іх жыцьцём, іх бытам, дапамагаць ім, популярызаваць іх, каб увесь комсамол мог браць з іх прыклад, а не наогул падыходзіць да ўдарніцтва.

Даць кожнаму станку пашпарт—вось лёзунг дзеяньня. Яго трэба правесьці ў жыцьцё яшчэ да пуску 518 заводаў.

Трэба шчыльна ўзяцца за цэхавае плянаваньне. У нас часта бывае так: ніхто ня ведае, што зрабіла брыгада за дзень, ня маюць ніякага ўяўленьня аб тым, якая на заводзе складзкая гаспадарка.

Пара, таварышы, пакончыць з размовамі на агульныя тэмы—аб тэхніцы, трэба як мага хутчэй аўладаць гэтай тэхнікай. Неабходна на гэтую справу сажаць такіх людзей, якія мелі-б пэўнае кола тэхнічных ведаў, неабходна наладзіць выпрацоўку програм, выдаваць літаратуру, падбіраць выкладчыкаў, выкарыстоўваць ляборатарыі, прыцягнуць вынаходцаў. Аўладаць тэхнікай—значыць аўладаць процэсамі вытворчасьці, аўладаць дакладна пэўным колам тэхнічных ведаў і вытворчых опэрацый. Вось, што патрэбна запомніць.

У зьвязку з пускам новых будоў, трэба абвясьціць вялікі ўсесаюзны двухмесячны ці трохмесячны паход ленінскага комсамолу за праверку гатоўнасьці да пуску ў тэрмін 518 новых заводаў і безадкладна, пасьля пленуму за гэтую справу ўзяцца—бяз крыку, бяз шуму, а па-дзелавому, па сур'ёзнаму, уклаўшы ў гэты паход пэўны зьмест.

У чым яно будзе выражацца?

У выяўленьні вузкіх месц, аграджаючых пуску ў тэрмін кожнага заводу і кожнага цэху, у праверцы расстаноўкі сіл, у праверцы падрыхтоўкі кадраў, у ўстаноўлены строгай пэрсональнай адказнасьці за об'екты работы.

Гэта будзе ня толькі паход комсамольскіх організацый на новых будовах—гэта будзе усесаюзны паход ўсяго ленінскага комсамолу.

5. Пад штандарам партыі—адзін мільён новых комсамольцаў

IX зьезд УсеЛКСМ вынес рашэньне аб ператварэньні комсамолу у шматмільённую організацыю. Гэта рашэньне IX зьезду прыкавалі ўвагу ўсяго саюзу. Мы у бюро ЦК, вытрымалі велізарную барацьбу за выкананьне гэтага рашэньня.

Я павінен проста заявіць: большасьць камітэтаў не зразумела гэтай задачы, як задачы патрабуючай неадкладнага выкананьня.

Два месяцы раскачваліся. І Цэнтральнаму камітэту прышлося прымяніць сыстэму, у поўным сэнсе гэтага слова, опэрацыйнага кіраўніцтва. Я маю на ўвазе пастанову ЦК аб тым, каб камітэты кожную пяцідзёнку інформавалі ЦК наколькі яны вырасьлі.

Трэба таксама сказаць, што шмат якія організацыі сказілі рашэньні зьезду. Гэтыя скажэньні ішлі галоўным чынам па лініі адмаўленьня ад выкананьня лёзунгу аб стопроцантным уцягненьні рабочай моладзі у комсамол і падмена яго лёзунгам аб уцягненьні лепшага маладога рабочага-ўдарніка.

За 5 месяцаў мы вырасьлі так як ніводная грамадзка-палітычная організацыя ў сьвеце ніколі не расла.

Цэлы мільён прышоў у комсамол за такі кароткі тэрмін, ды яшчэ пры індывідуальным адборы. Гэта зьява вельмі буйнага парадку.

Гэты рост тлумачыцца двума момантамі; бязумоўна правільнасьцю генэральнай лініі парты і гарачай барацьбой ленінскага комсамолу за яе практычнае ажыцьцяўленьне. Другога тлумачэньня быць ня можа.

Сапраўды моцная краіна Саветаў, сапраўды магуча партыя бальшавікоў, калі змаглі сабе ўтварыць такую зьмену.

За гэты час палепшыўся і якасны склад організацыі. З асьцярожнасьці я нехачу называць лічбаў, але ва ўсякім выпадку тэндэнцыя на палепшаньне якаснага складу бясспрэчна відавочна і пролетарскае ядро ў саюзе прыкметна павялічылася.

А як абстаіць справа з цякучасьцю?

Тут таксама пэўнае паляпшэньне.

Калі за 3 мес. папярэджваемыя IX зьезду, з саюзу вышла 250.000 чалавек, дык за апошні час цякучасьць зьменшылася да 180 тысяч за квартал. Аднак, і гэта вельмі многа, гэта гаворыць аб тым што мы задачу барацьбы з цякучасьцю яшчэ не паставілі як баявую задачу.

Для таго, каб паставіць як належыць барацьбу з цякучасьцю, трэба, перш за ўсё забясьпечыць за сабой той мільён новых комсамольцаў, які мы уцягнулі.

Пераходжу да вывадаў. Першая задача: замацаваць уноў прышоўшы ў комсамол мільён чалавек. Гэта вельмі адказная задача.

Папершае, трэба ўцягнуць уноў прышоўшых у саюз комсамольцаў у актыўную грамадзкую работу, ва ўдарніцтва і соцыялістычнае спаборніцтва; падругое, трэба паставіць справу палітычнай адукацыі на належную вышыню, для чаго мобілізаваць пабольш народу на пропагандысцкую работу. Гэта рашаючыя моманты пастаноўкі работы з навічкамі.

Другая задача—не здавольвацца тым, што ўжо дасягнута. Гэта-ж толькі першапачатковыя посьпехі. Рашэньні-ж IX зьезду аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю яшчэ ня выканаі! Пагэтаму конкрэтны і мобілізуючы лёзунг—к 17 МЮД'у завяршыць 100 проц. уцягненьне рабочай моладзі ў комсамол пры індывідуальным адборы і 17 МЮД завербаваць у комсамол ня менш паўтара мільёна новых членаў.

Нарэшце, трэцяя задача, выцякаючая з пытаньня аб росьце—перадача комсамольцаў у партыю. К 17 МЮД ўсё лепшае, што ёсьць ў комсамоле з рабочай моладзі і асобныя лепшыя маладыя колгасьнікі—у агульнай колькасьці ня менш 300 тысяч чалавек—павінна быць перадана ў партыю.

6. У новых абставінах нельга працаваць па-старому

Задачы, як бачыце, вялікія, складаныя, якасна больш высокія, чым тыя, якія мы вырашалі раней.

Адсюль, таварышы, уся палкасьць пытаньня аб перабудове кіраўніцтва. Кіраўніцтва павінна забясьпечыць выкананьне якасна больш складаных задач.

У чым недахоп саюзнага кіраўніцтва? Яно агульна, у ім мала опэрацыйнасьці, у ім многа, так званай колегіяльнасьці і мала пэрсональнай адказнасьці за конкрэтную справу. Атрымліваецца тая-ж своеасаблівая абязьлічка. Трэба гэтую справу ліквідаваць.

Там, дзе шмат пішуць і шмат засядаюць, там, дзе прымаюць рэзолюцыі на 10 старонках і плян з 155 пытаньнямі,—там няма тэмпу, там няма якасьці.

Трэба, папершае, адмовіцца ад камісыйнага мэтоду працы, практываць яго толькі ў выключных выпадках.

Трэба, па-другое, менш пытаньняў ставіць на паседжаньнях, а палову у крайнім выпадку вырашаць пэрсональна—сэкратару, загадчыку аддзелу члену бюро.

Трэба па-трэцяе, адмовіцца ад напісанага закону—сьцьвярджэньня рэзолюцый ў асноўным. Трэба устанавіць сыстэму прыняцьця канчатковага рашэньня па пытаньню. Гэта навучыць ўсіх нас да больш адказных адносін да сваіх дырэктываў і прымусіць лепш прапрацоўваць іх загадзя, да зацьвярджэньня.

Трэба па чацьвёртае забараніць частыя паседжаньні, дапускаючы ў дэкаду толькі адно паседжаньне сэкратарыяту і адно паседжаньне бюро абкому і крайкому. А то засядаюць па 5-6 разоў ў дэкаду, а працаваць некалі. Ды і самі паседжаньні як правіла не павінны працягвацца больш 4 гадзін.

Трэба па пятае, перагледзець практыку паездак на месцы і спыніць экскурсіі, утвараемыя пад выглядам брыгад і камісій, забараніць „абсьледваць" і на месцы езьдзіць толькі для дапамогі.

Трэба па-шостае, безадкладна перанструктаваць і перападрыхтаваць ў духу гэтых прапаноў увесь організацыйны інструктарскі апарат саюзу, пачынаючы з ЦК і канчаючы заўкомам.

Трэба, па-сёмае утварыць бясплатныя добраахвотныя групы, сыгнальныя пасты па праверцы выкананьня у кожнай ячэйцы, ўцягнуць у гэтую справу добрую сотню тысяч чалавек.

Трэба, увосьмых, каб другі сэкратар абкому ці крайкому, а там дзе іх няма, дык заг. орг. аддзелу тры чвэрці свайго часу асыгнавалі на праверку выкананьня, на утварэньне такіх організацыйных прадпасылак, якія забясьпечылі-б правядзеньне ў жыцьцё прымаемых рашэньняў. Раз у дэкаду трэба наладжваць кантрольныя сэкратарыяты. Адзін з сэкратароў ЦК павінен спэцыяльна сядзець на праверцы выкананьня і кіраваць яе пастаноўкай на мясцох.

Трэба па-дзявятае, завесьці спэцыяльныя таварыскія суды у ячэйках і камітэтах, якія судзілі-б усіх тых, хто ня выконвае саюзных рашэньняў, утварыць цэлы грамадзкі [illegible] комсамоле вакол праверкі [illegible].

Вось тое, што я ў [illegible] хацеў сказаць і што бюро ЦК прапануе вашай увазе.

Генэральны сэкратар ЦК УсеЛКСМ тав. КОСАРАЎ

СУПРОЦЬ ПРОВОКАЦЫЙНАЙ РАСПРАВЫ НАД 9 НЭГРЫЦЯНСКІМІ РАБОЧЫМІ

ГРАМАВЫЯ РАСКАТЫ ПРОТЭСТАЎ—ГРАЗА КАТАМ СКОТСБОРА

Прэч белы тэрор

Служачыя колектыву СНК, рабочыя друкарні, гаражу і сталоўкі заслухаўшы інформацыю аб правакацыйным прысудзе над 9-ю маладымі рабочымі нэграмі, выказваюць свой рашучы протэст супроць зьверстваў фашызму.

—Амэрыканская буржуазія сеючы расавую ненавісьць, імкнецца адцягнуць рабочую масу ад рэволюцыйнай барацьбы. Але гэта ім ня ўдасца. Крызіс капіталістычнай сыстэмы ўсё больш і больш паглыбляецца і рэволюцыйны рух расьце.

Пролетарыят і прыгнечаныя ўсіх краін усё больш згуртоўваюцца вакол компартыі пад лёзунгам абароны СССР

Мы патрабуем скасаваньня прысуду, вызваленьня 9 рабочых нэграў—нашых братоў па клясе.

Прэч белы тэрор.

Няхай жыве міжнародная інтэрнацыянальная солідарнасьць працоўных усіх краін і народаў.

Няхай жыве правадыр сусьветнай пролетарскай рэволюцыі—III Інтэрнацыянал.

Прот:стуем супроць провокацыйнага прысуду

Заслухаўшы паведамленьне аб асуджаных на пакараньне сьмерцю 9 маладых нэгрыцянскіх рабочых, мы, вучні Слуцкага саўгасвучу рашуча протэстуем супроць провокацыйнага прысуду буржуазнага суда, патрабуем скасаваньня прыгавуру.

У адказ на гэты прысуд мы яшчэ больш згуртуемся вакол партыі Леніна і яе ЦК, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна.

Няхай жыве комуністычная партыя.

Няхай жыве МОПР—дапаможнік барацьбітам рэволюцыі.

Па дарученьню— А. Шпакоўскі

Кітай

Рэволюцыйныя лістоўкі сярод салдат

ШАНХАЙ. 5. Учора у Шанхаі распаўсюўжваліся лістоўкі з зваротам да салдат, падпісаныя рэволюцыйным салдацкім камітэтам провінцыі Цзянсу. У лістоўках паведамляецца аб дзеяньнях кітайскай Чырвонай арміі а таксама аб рабоча-сялянскім руху. Учора распаўсюджваліся таксама лістоўкі у зьвязку з пакараньнем сакратара кітайскай компартыі Цян-Чу-Фа.

Разбуральная паводка

ШАНХАЙ. 5. З рознастайных частак краіны паведамляюць аб разбуральных паводках. У адной провінцыі Фучжоў, у часе паводкі загінула 50 чалавек, учынена страт на 1 мільён даляраў.

Не за „сьвяточную“, а за штодзённую баявую опэрацыйную насьценгазэту

Насьценгазэты на сёньнешні дзень павінны зьявіцца організатарамі працоўных мас на выкананьне задач пастаўленых перад даным прадпрыемствам, колгасам, саўгасам.

Цэлы шэраг насьценгазэт месяцамі не мяняюць матар'ялы, выпускаюцца толькі да рэволюцыйных сьвят, тым самым страчваюць свой твар.

Такое становішча нецярпіма.

Кожная комсамольская ячэйка, кожная рэдколегія павінна паставіць перад сабой мэту зрабіць насьценгазэту штодзённай баявой, опэрацыйнай, асьвятляючы ў ёй усе жыцьцё цэху, агрэгату, колгасу і г. д.

Перайсьці ад самацёку ў працы насьценгазэт і юнкораў да сталага штодзённага кіраўніцтва. Дабіцца, каб кожны юнсьценкораўскі допіс, абзац, які сыгналізуе аб тым ці іншым недахопе, атрымаў належнае рэагаваньне.

Змагацца за дзейнасьць кожнай насьценгазэты,—баявая задача.

Да зьезду рабселькораў ня рыхтуюцца

ВІЦЕБСК (БЕЛТА). Рэйд брыгад праведзены Гар КК РСІ і рэдакцыяй газэты „Віцебскі пролетары“ паказаў, што шэраг буйнейшых прадпрыемстваў Віцебску ня рыхтуецца да зьезду рабселькораў. Наглядаецца поўная недаацэнка ролі нізавога друку і разгортваньня рабселькораўскага руху.

На лесазаводзе пастанова ЦК Усе КП(б) аб перабудове рабселькораўскай работы не прапрацавана, рабкоры аб новых формах працы ня ведаюць. Шматтыражка „Першы ўдарнік“ выходзіць нерэгулярна. На заметкі не рэагуюць. Тэзісы не прапрацаваны.

Такое становішча і на ігольнай фабрыцы.

На заводзе „Чырвоны мэталісты“, чыгунцы, фабрыцы Лекерта і г. д. насьценгазэты па два месяцы ня выходзяць. На зьмяшчаемыя дописы як у цэнтральным, так і нізавым друку, ніхто не рэагуе. Кіраўніцтва юнкорамі і нізавым друкам адсутнічае. Нерэагаваньне на заметкі зьяўляецца звычайным.

Газэтнае аддзяленьне пры вячэрнім комвузе наведваюць замест 100 чалавек—20-25. Партколектывы і фабкомы не аслабаняюць слухачоў газэтнага аддзяленьня ад грамадзкіх нагрузак.

Прэзыдыум гар. КК РСІ у сваёй пастанове па пытаньню разгортваньня падрыхтоўкі да рабселькораўскага зьезду вынес шэраг мерапрыёмстваў па зьнішчэньню азначаных недахопаў. Для папамогі ў падрыхтоўцы да зьезду акулярнай фабрыкі лесазаводу, скурзаводу, фанэрнаму,—прымацаваны 10 чал. з актыву гар. КК.

ЗА БАЯВУЮ НАСЬЦЕНГАЗЭТУ

Віцебск. Насьценгазэта „Малады Ударнік“, якая выходзіць у шостай сямігодцы з сваімі задачамі не спраўляецца. Самымі галоўнымі недахопам зьяўляецца тое, што рэдколегія не змагла організаваць вакол сябе актыў сьценкораў, гэта кажа тое, што у насьценгазэце ўдзельнічаюць толькі два-тры вучні.

На зьмяшчаемыя дописы ніхто не рэагуе. Дзякуючы таму, што з боку грамадзкіх організацый ня было належнага кіраўніцтва работай з сьценкорамі і насьценгазэтай, апошняя дапускала рад палітычных памылак, напрыклад: у адным нумары яна піша, што той, „хто хоча стаць сьценкорам, павінен падаць аб гэтым заяву ў рэдколегію“.

Ніхто не заняўся растлумачэньнем гэтай памылкі. Яна прайшла міма вушэй грамадзкіх організацый.

У 4-й і 16-й школе насьценгазэты да месячніку друку ніякай падрыхтоўкі не праводзяць. Нават гэтае пытаньне не стала на паседжаньні рэдколегіі.

Вопыт працы ўдарных брыгадаў друку не практыкуецца. Газэты выходзяць па кампанійску, не зьяўляюцца організатарам вучнёўства, а наадварот, самі замазваюць каштоўныя факты, якія выкрываюць сьценкоры ў сваіх дописах.

Юнкор-брыгада „Ч. З.“
Усыскін,
Ваўчок З.

Сьпяць непрабудным сном...

У мінулым годзе ў саўгасе Івань група рабселькораў актыўна дапамагала выпуску насьценгазэты, апошняя зьяўлялася актыўным барацьбітом за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Але зараз становішча рэзка зьмянілася, дзякуючы нядбайным адносінам і недаацэнкі разгортваньня рабселькораўскага руху з боку ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ. Рабселькораўскі гурток распаўся. Насьценгазэта выдаецца пры мізэрным удзеле сьценкораў. Перавыбары рэдколегіі не праведзены. Падрыхтоўка да рабселькораўскага зьезду зусім не праводзіцца.

Трэба даць па руках зрыўшчыкам важнейшай палітычнай кампаніі.

(*Слуцак*) **А. Шпакоўскі.**

Трэба падцягнуцца

Ні куды ня варта пастаўлена выпіска „Чырвонай Зьмены“ ў Прапойскім раёне. Цэлы рад ячэек (Гіжанская, Александроўская і г. д.) да гэтага часу ня выпісваюць ніводнага экз.

Райком комсамолу ўжо спрабаваўся некалькі раз даць кантрольныя лічбы ячэйкам, але ні разу не пацікавіўся праверыць як ячэйкі выконваюць заданьні.

Ударны двухмесячнік распаўсюджваньня „ЧЗ“ павінен даць рашучы пералом у выпісцы „ЧЗ“ і пакрыць ранейшы прарыў.

Вольны.

Адказны рэдактар **МІХ. ПЛАТАЎ.**



Супярэчнасьці якія існавалі ў рабочым спортыўным руху між прыхільнікамі рэформістых і комуністымі асабліва абвострыліся пасьля конгрэсу рэформіцкага спортыўнага інтэрнацыяналу у 1927 годзе ў Гельсінгфорсе. На гэтым конгрэсе, па прапанове нямецкага прадстаўніка Гелетарта было вырашана далучыцца да другога інтэрнацыяналу. З гэтага часу бюрократы спортыўнага руху пачалі падаўляць усялякую вольную думку сярод членаў рабочых спортыўных грамад. Іх мэтай было выкарыстаць адзін мільён членаў пролетаркіх спортыўных грамад для патрэб фашысцкай рэспублікі.

Спортыўныя організацыі некаторых акруг Нямеччыны, як Бэрлін, Гельле-Мэрзенбург, Рэйнская провінцыя—супроць гэтай, тэндэнцыі бюрократаў. Самі бюрократы праз правакацыі, яшчэ хутчэй прымусілі не рэформістых прыняць гэта рашэньне. На зьезьдзе нямецкіх рабочых спортыўных організацый у 1928 годзе у Лейпцыгу бюрократы анулявалі ўсе мандаты дэлегатаў Бэрліну мотывуючы гэта тым, што усе яны комуністы. Гэты фашысцкі наступ бонз выклікаў новую хвалю протэсту. Цэлыя акругі солідарызаваліся з дэлегатамі Бэрліну.

Бюрократы адказалі на гэта шалёным паклёпам на старонках социял-фашысцкага друку па поваду спартакіяды ў Маскве. Яны абвясьцілі, што спортыўны саюз, які будзе пасылаць дэлегатаў на спартакіяду, будзе выключаны з „Саюзу рабочых спортыўных організацый“. Ня гледзячы на усе забароны, мы, 190 рабочых спортсмэнаў усіх палітычных напрамкаў, паехалі на спартакіяду, і ня толькі для таго, каб памерацца сіламі з пролетарскімі спортсмэнамі СССР, але і для таго, каб дэмонстраваць нашу гатоўнасьць стаць на абарону краіны Саветаў!

У СССР мы маглі толькі зьдзіўляцца калі сваімі вачыма ўбачылі, што пролетарыят дасягнуў сваімі сіламі ў вобласьці народае гаспадаркі галоўным чынам ў вобласьці культурнага будаўніцтва. Мы пераканаліся ў баяздольнасьці клясавай організацыі пролетарыяту—чырвонага спортыўнага Інтэрнацыяналу. Калі мы зьвярнуліся у Нямеччыну, мы разьехаліся агітаваць за павялічэньне арміі прыхільнікаў Савецкага Саюзу.

Бюракраты на гэта адказалі узмоцненымі рэпрэсыямі супроць рэволюцыйных спортсмэнаў. Зараз-жа пасьля Маскоўскай спартакіяды яны выключылі з саюзу рабочых спортыўных організацый самы вялі спортыўны саюз Бэрліну 30000 членаў—„Фіхтэ“, таму, што гэты саюз выхоўваў сваіх членаў у духу клясавай барацьбы. Бюрократы пагражалі выключыць усіх тых, хто будзе падтрымліваць якую-небудзь спортыўную сувязь з чырвоным бэрлінскім саюзам „Фіхтэ“.

ПАЗШ. Поліцыя арыштавала рэволюцыйнага рабочага

Але, барацьба бюракратаў супроць рэволюцыйнага рабочага руху пацярпела вялікі крах. Тысячы рабочых спортсмэнаў за межамі Бэрліну солідарызаваліся з бэрлінскім „Фіхтэ“.

На конфэрэнцыі усіх выключаных і опозыцыйных спортыўных саюзаў 26-га мая 1929 г. у Бэрліне была заснавана „аб'яднаньне устанаўленьня адзінства у рабочым спорце“.

2 гады прайшло з таго часу. Сёньня гэтае „аб'яднаньне“—магутная організацыя, у якую ўваходзяць каля 3000 рабочых рэволюцыйных спортыўных організацый з 500000 членамі. Гэта адзінае пролетарскае аб'яднаньне яно склікае ад 4-12 ліпеня спартакіяду ў Бэрліне?

Два фронты у рабочым спортыўным руху стаяць сёньня адзін супроць другога. З аднаго боку рэволюцыйныя рабочыя спортыўныя організацыі, якія змагаюцца за аслабаненьне пролетарыяту ад ланцугоў капіталізму,—з другога боку рэформісцкія спортыўныя саюзы, якія праклямуюць веру у „дэмократычную рэспубліку, якія падаўляюць усялякае рэволюцыйнае выступленьне сваіх членаў, якія рыхтуюць будучую армію для імпэрыялістычнай Нямеччыны у барацьбе капіталістычнага сьвету супроць Савецкага Саюзу. Яшчэ сотні тысяч сумленых рабочых не раскусілі сутнасьць гэтых здрадніцкіх організацый і лічацца членамі гэтых організацый. Але, і сярод іх расьце опозыцыя супроць фашысцкай політыкі іх правадыроў і рэволюцыйныя спортыўныя організацыі знаходзяць сярод іх усе большы водгук.

Вялізарнае абурэньне рабочых

БЭРЛІН, На шматлікіх бэрлінскіх прадпрыемствах рабочыя ўчора на сходах абгаварвалі пытаньне аб забароне спартакіяды. Сярод рабочых гэтая забарона выклікала вялізарнае абурэньне.

У прынятых на сходах рэзолюцыяй протэсту, рабочыя заяўляюць, што яны будуць весьці рашучую барацьбу супроць поліцэйскага тэрору.

Зьбіеньні беспрацоўных

БЭРЛІН.—На біржы працы ў Зайдэльштрасе адбылася сур'ёзная сутычка паміж беспрацоўнымі і поліцыяй. У час сутычкі поліцыя зьбівала беспрацоўных дубцамі.

Іскры радыё

* ПАРЫЖ. „Юманітэ“ паведамляе, што рабочыя рымскіх прадпрыемстваў па апрацоўцы рысу, з прычыны спробы прадпрымцаў зьнізіць ім зарплату на 50 процантаў, пад кіраўніцтвам Італьянскай конфэдэрацыі працы (рэволюцыйнай) абвясьцілі стачку. Поліцыя правяла ўсюды масавыя арышты.

* ПАРЫЖ. У Сэвільлі сёньня пачынаецца стачка служачых харчовых магазынаў у знаку солідарнасьці з бастуючымі разносчыкамі малака.

ПАСТЫ І ДАЗОРЫ ДАНОСЯЦЬ

Сакалішчанская ячэйка ЛКСМБ (Расонскага раёну) не разгарнула працу па рэалізацыі пазыкі „3-га рашаючага“.

Юнкор „М. З.“

Працу па распаўсюджваньню позыкі ў саўгасе Гаўрылеўка (Пухавіцкага раёну) не разгорнута. Комсамольская і партыйная ячэйкі нічога ня робяць.

Ліско.

На Тальскаму сельсавету, Любаньскага раёну, не праводзілася растлумачальная праца па рэалізацыі пазыкі.

Настаўнікі, работнікі сельсавету і асобныя комуністыя і комсамольцы абмежаваліся толькі тым, што самі падпісаліся, а ніякай працы праводзіць не жадаюць.

Бурдо.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599